*Г. А. Савеня, Н. П. Лобань (Мінск, Беларусь)*

# НАЗВЫ СУЧАСНАГА АБУТКУ: АСАБЛІВАСЦІ НАМІНАЦЫІ

Надаючы вялікую ўвагу адзежы, людзі вельмі часта не задумваюцца пра абутак, хоць ён з'яўляецца неад'емнай часткай любога жаночага і мужчынскага касцюма і можа кардынальна яго змяніць. У залежнасці ад абставін, стылю, надвор'я мы выбіраем той ці іншы яго від. На сённяшні дзень існуе вялікая колькасць разнастайных відаў і падвідаў абутку, гэта звязана з моднымі тэндэнцыямі, функцыянальнасцю і г. д. Таму, каб лёгка адрозніваць оксфарды ад вінклпікераў, неабходна ведаць не толькі іх прыметы, а і паходжанне той ці іншай назвы.

Праводзіць класіфікацыю абутку можна паводле розных дыферэнцыйных прымет: паводе матэрыялу для вырабу, прызначэння, часу выкарыстання, наяўнасці шнуроўкі, апрацоўкі і перфарацыі, для асобы якога полу ён прызначаны. Але апошняя прымета ў наш час страчвае сваю вызначальнасць, што звязана з тым, што абутак, які раней прызначаўся толькі для мужчын, сёння разглядаецца як універсальны (“унісекс”).

У артыкуле паспрабуем вызначыць новыя найменні сучаснага (моднага) мужчынскага і жаночага абутку, а таксама прасачыць, адкуль яны бяруць свой пачатак, сваё паходжанне.

Да групы “Назвы сучаснага абутку” адносяцца наступныя найбольш пашыраныя намінацыі:

**Біркенштокі** – сандалі, якія звычайна складаюцца з падэшвы з мяккай сцелькай і двух рамнёў. Назва пайшла ад прозвішча нямецкага шаўца Ёхана Адама Біркенштока, які яшчэ ў 1774 годзе пачаў займацца вырабам артапедычнага абутку.

**Брогі** – туфлі, дэкарыраваныя перфарацыяй, якая можа размяшчацца ўздоўж швоў, на задніках (англ. *brogues*). Могуць быць як з адкрытай шнуроўкай, так і з закрытай, у народзе іх называюць “*туфлі з дзірачкамі*”. Перашапачаткова брогі ўвайшлі ва ўжытак у Шатландыі. Фермеры, якія працавалі на балоцістай мясцовасці, любілі насіць брогі з прычыны іх функцыянальнасці: брагіраванне (*broguing*) дазваляла абутку праветрывацца.

**Вінклпікеры –** вастраносыя туфлі на роўнай падэшве, якія атрымалі сваю назву менавіта за знешні выгляд. *Вінклпікер* – у перакладзе з англійскай мовы *вострая іголка*, пры дапамозе якой даставалі малюскаў з ракавіны. У 80-я гады XX стагоддзя гэты абутак лічыўся старамодным, аднак сёння ён ізноў вяртаецца ў моду.

**Дорсэ** – фасон туфель, якія закрываюць насок ды пятку і адкрываюць выгін ступні. Сваю назву гэтыя туфлі атрымалі ў гонар Альфрэда Гіёма д'Орсэ – знакамітага заканадаўца мод у Францыі.

**Дэзерты** – чаравікі з замшавым верхам на гумавай падэшве з дзвюма парамі адтулін для матузкоў. Сваёй назвай яны абавязаны іх стваральніку Натану Кларку, які падчас службы ў Егіпце заўважыў гэты абутак на ваенных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(англ. *desert – пустыня*), а па вяртанні ўзнавіў яго, зрабіўшы лёгкім, каб падыходзіў для гарачага клімату.

**Дэрбі –** туфлі з адкрытай шнуроўкай, супрацьлегласць оксфардам. Туфлі могуць быць з перфарацыяй ці без яе, яны не настолькі афіцыйныя. Адны эксперты лічаць, што гэты абутак быў вынайдзены яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя пры чатырнаццатым князі Дэрбі. Першыя пісьмовыя звесткі пра гэты абутак датуюцца 1862 годам.

**Лабутэны (лубутэны)** класічныя – гэта чорныя ці бэжавыя лодачкі на абцасе, заўсёды з чырвонай падэшвай. Назва абутку паходзіць ад прозвішча іх стваральніка – француза Крысціяна Лубутэна. Для свайго абутку Лубутэн выкарыстоўвае найлепшыя матэрыялы: скуру змяі і алігатара.

**Лоферы –** камфортны абутак, які вонкава нагадвае макасіны, але бліжэй да мадэлі пантофляў. У лофераў прадугледжана шчыльная падэшва, наяўнасць невялікага абцаса і дэкарыравання пэндзлікам на берцах. Назва *лоферы* пайшла ад англійскага слова *loafer*, што ў перакладзе азначае *лайдак*. Гэта звязана з тым, што лоферы напачатку былі папулярныя сярод маракоў, якія ў час знаходжання на сушы толькі і рабілі, што гулялі.

**Макасіны** — мяккія скураныя чаравікі, традыцыйны абутак паўночнаамерыканскіх індзейцаў. На англійскай мове – *moccasins***.** Сама ж назва ўзыходзіць да пратаалганкінскага *maxkeseni* – што значыць *абутак*.

**Марцінсы** — абутак армейскага тыпу для паўсядзённага жыцця. Быў названы ў гонар свайго стваральніка – ваеннага ўрача Клаўса Марценса.

**Монкі –** туфлі, якія вырабляюцца са скуры або замшу, у іх няма шнуроўкі, на яе месцы прысутнічае адна ці дзве папружкі. Назва гэтага абутку паходзіць ад англійскага слова *monk – манах*, паколькі раней гэты абутак насілі манахі.

**Мюлі** – туфлі без задніка, могуць быць як на роўнай падэшве, так і на абцасе. Дакладна не вядома, хто прыдумаў гэту мадэль, аднак яшчэ ў Старажытным Рыме гэты абутак быў папулярны сярод мужчын, якія займалі высокія палітычныя пасады. Назва *мюлі* з лацінскай мовы *mulleus calceus* перакладаецца як *мыслiўца*.

**Оксфарды -** строгія туфлі з закрытай шнуроўкай, якія вырабляюцца пераважна з гладкай скуры, радзей сустракаюцца з замшу або лакіраванай скуры. Першапачатковая назва *балмаралы* – у гонар каралеўскага палаца Балмарал у Шатландыі. У XIX стагоддзі гэты абутак стаў незвычайна папулярны сярод студэнтаў Оксфардскага ўніверсітэта, што і паслужыла прычынай іх перайменавання.

**Сліперы –** абутак, у якім прадугледжаны аксаміцісты верх з манаграмай, скураная тонкая падэшва і невялікі абцасік, а таксама інтэграваны язычок. Раней яны выконвалі функцыю дамашніх тапак, якія насілі брытанскія арыстакраты XIX стагоддзя. Назва пайшла ад англійскага *to slip – слізгаць.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Сліпоны** – лёгкія кеды без матузкоў (англ. *slip-ons – без шнуроўкі*), якія складаюцца з верхняй часткі з парусіны і гумавай падэшвы. Першапачаткова гэты абутак быў папулярны сярод аматараў сёрфінгу.

**Тапсайдары** – абутак, падэшва якога з глыбокімі пратэктарамі з гумы, пафарбаванай у белы колер, з матузкамі на чатыры адтуліны і з матузком уздоўж задніка (англ. *top-siders*). Верхняя частка можа быць са скуры, замшу або тэкстылю. Носіцца без шкарпэтак, на босую нагу. Першапачаткова прызначаліся для носкі на палубе яхты, бо светлая падэшва не пакідала слядоў на бялюткіх яхтах.

**Угі –** максімальна камфортны абутак (боты) з мехам аўчыны ўнутры і прагумаванай падэшвай. Вышыня халявы можа быць рознай: ад шчыкалатак да самага калена. Мяркуюць, што з'явіліся ўпершыню ў Аўстраліі або Новай Зеландыі (стваральнікамі '*аўстралійскіх валёнкаў*' лічацца аўстралійскія авечкагадоўцы). Слова *угі* (*uggs*) выкарыстоўваецца як назва гандлёвай маркі (*Ugg*), так і сучаснага абутку з аўчыны.

**Хілісы (хелесы) –** красоўкі з невялікімі коламі (англ. *heelis – пятачкі*). Колы ўстаўляюцца ў пятку і здымаюцца пры дапамозе ключа.

**Чука (чака)** – закрыты (мужчынскі) абутак вышынёй да шчыкалаткі з тонкай шнуроўкай на 2 – 3 адтуліны. Першапачаткова абутак для гульні ў пола. Менавіта гэта і стала штуршком да наймення абутку. Справа ў тым, што перыяд (раунд 7,5 хвілін) гэтай гульні называецца *chukka* або *chukker*. Традыцыйна чука (чака) шыюцца з цэльнага кавалка скуры ці замшу, тэкстылю без падкладкі, мысок закруглены, шнуроўка адкрытая і кароткая.

**Чэлсі –** абутак з невысокай халявай з закругленым мыском, тонкай падэшвай і невялікім абцасам (англ.*chelsea*). Чаравікі вельмі зручна насіць з джынсамі, штанамі і нават сукенкамі. Па баках у такім абутку – устаўкі з гумы, больш ніякіх дэкаратыўных элементаў не прадугледжана. Чаравікі чэлсі – стыль каралевы і музыкаў. Выпускаць такую мадэль пачалі яшчэ ў XIX стагоддзі з мэтай стварэння больш зручнага абутку для верхавой язды. Чаравікі стварыў шавец Джозэф Спаркс-Хол для каралевы Вікторыі ў 1851 годзе для конных прагулак: па яе просьбе абавязкова без матузкоў, бо яны заблытваліся ў стрэмені падчас язды. Спачатку гэты абутак называлі "*paddock boots*", што літаральна азначае "*пляцоўка каля стайні*".

**Эспадрылы –** від летняга лёгкага абутку, які вызначаецца плеценай падэшвай і натуральным, часцей за ўсё тэкстыльным, верхам. Першапачаткова гэты абутак пачалі вырабляць у Іспаніі: падэшву рабілі з канатнай травы, а верх – з таннага джуту. Назва паходзіць з французскага *espadrilles*. У Іспаніі іх называюць *espartenas*. Ва ўсіх найменнях ёсць прамое ўказанне на расліну *эспарта,* з якой выраблялі вяроўкі для падэшвы. З цягам часу гэты від абутку стаў папулярны не толькі ў Іспаніі, а і ў іншых краінах Еўропы.

Такім чынам, у артыкуле разгледжана толькі невялікая, найбольш пашыраная, частка найменняў сучаснага абутку. Як бачым, усе гэтыя назвы запазычаныя з іншых моў, але трэба адзначыць, што агульныя прынцыпы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўяўленні, пакладзеныя ў аснову намінацыі, часцей за ўсё з’яўляюцца ўніверсальнымі. На самой справе, такіх намінацый значна больш і яны таксама патрабуюць свайго вытлумачэння як у лексіка-семантычным, так і ў культурна-гістарычным аспектах.


1. Слоўнік моды // Мова нанова [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.movananova.by/zaniatki/slounik-moda-2.html. – Дата доступу : 05.09.19.
2. Усе віды абутку: класічнага і спартыўнага // Men’s den [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://be.hemale.club/971-all-types-of-mens-shoes-classic-and-sports.html. - Дата доступу : 05.09.19.
3. Все виды обуви, список с фото: мужская и женская обувь от А до Я // obliqo [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://obliqo.ru/vse-vidy-obuvi-spisok-s-foto/#chakka.html/ - Дата доступу : 08.09.19.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ